**УДК 72.009**

# З НАГОДЫ 500-ГОДДЗЯ БЕЛАРУСКАГА І ЎСХОДНЕ-СЛАВЯНСКАГА ПІСЬМЕНСТВА: ВОБРАЗ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ Ў ТВОРАХ МАНУМЕНТАЛЬНАЙ СКУЛЬПТУРЫ

***канд. мастацтвазнаўства, дац. М.П. ЧАЙКО***
**Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы**

*Прадстаўлены мастацтвазнаўчы аналіз скульптурных помнікаў, прысвечаных ўсходнеславянскаму першадрукару Францыску Скарыне. Аб'ектам даследавання сталі манументальныя скульптурныя творы беларускіх аўтараў, рэалізаваныя на мяжы XX–XXI стагоддзя як на тэрыторыі Беларусі, так і за яе межамі. На прыкладзе манументальных скульптурных твораў прысвечаных Францыску Скарыне выяўлены характэрныя тэндэнцыі развіцця манументальнай скульптуры гістарычнага жанру. Асаблівая ўвага нададзена раскрыццю асноўных прынцыпаў тэматычнага і кампазіцыйнамастацкага формаўтварэння ў сучаснай манументальнай скульптуры Беларусі. Даследаванне раскрывае агульную спецыфіку развіцця манументальнай скульптуры Беларусі канца XX–пачатку XXI стагоддзя.*

**Уводзіны**. Мяжа XX–XXI ст. адметная наватарскай, унікальнай па сваёй значнасці, тэндэнцыяй у беларускай манументальнай скульптуры, у якой значнае месца займае гісторыка-нацыянальная тэматыка. Асаблівае месца тут належыць тым, хто ствараў духоўныя каштоўнасці, герою, які нясе на сабе пячатку свайго часу, рысы агульначалавечага ідэалу, маралі, гуманізму. Кожны час мае сваіх герояў, іх параджае грамадская свядомасць, катэгорыя рухомая і зменлівая, яна дэманструе прыярытэты ў сацыяльных і культурных сферах, што знаходзяць выяўленчы вобраз у помніку.

У галерэі вобразаў культурных і грамадскіх дзеячаў Беларусі Францыску Скарыне належыць асаблівае месца. Для сучаснага грамадства ўсходне-славянскі першадрукар – сімвал нацыянальнага адраджэння.

Вобразы асветнікаў Ф. Скарыны, С. Буднага, П. Мсціслаўцу, увасобленыя ў манументальнай скульптуры ў розныя гістарычныя перыяды, з'яўляюцца своеасаблівымі носьбітамі духоўнай самасвядомасці беларускага этнасу, у іх закладзены актуальныя ва ўсе часы ўяўленні аб сацыяльных і маральных каштоўнасцях. У гэтым сэнсе помнікі з'яўляюцца культурнай і духоўнай памяццю народа, нацыі, дзяржавы. Інтарэс з боку скульптараў да распрацоўкі мастацкіх вобразаў беларускіх асветнікаў супадае з актывізацыяй гістарычнага жанру ў выяўленчым мастацтве.

Гістарычная тэма досыць выразна прагучала ў беларускім мастацтве ў 70–80 гг. XX ст. Менавіта ў гэты перыяд рэалізаваны першы манументальны твор, прысвечаны Францыску Скарыне (1974, Полацк, Віцебская вобласць, скульптары А. Глебаў, І. Глебаў, А. Заспіцкі, архітэктар В. Марокін). Помнік устаноўлены на цэнтральнай плошчы старажытнага горада, заснаваны на прынцыпах архітэктурнаскульптурнага сінтэзу. Высокі дынамічны пастамент, што ўвасабляе настойлівае імкненне чалавецтва да новых спасціжэнняў разам з рэнесанснай па духу згарманізаванай пластыкай постацці першадрукара ўтвараюць прасторава актыўны манумент.

Нягледзячы на дыстанцыраваннасць скульптурнай выявы Ф. Скарыны, узнесены вертыкалізм агульнай кампазіцыі помніка, нельга не адчуць сканцэнтраванасць, адухоўленасць твару, моц, велічнасць духа першадрукара. Мастацкая выразнасць полацкага помніка дасягнута паслядоўнай распрацоўкай вобраза беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара А. Глебавым у станковай скульптуры. "Тонкая інтэлектуальнасць твару, кніга і гранка ў напрацаваных руках, спакойная пластыка фігуры, задрапіраванай доўгімі глыбокімі складкамі падпяразанай рубахі, знаёмая па вядомаму графічнаму партрэту шапачка дапамагаюць перадаць пераканаўчасць характарыстыкі вобраза Скарыны" [1, с. 303].

**Асноўная частка**. Асветніцкія грамадзянскія ідэалы шырока прадстаўлены гісторыка-нацыянальнай тэматыкай ў выяўленчым мастацтве новага перыяду ў межах суверэннай дзяржавы. Сучасная манументальная скульптура Беларусі выяўляе грамадска-патрыятычныя, нацыянальныя і філасофскія ідэі часу, адлюстроўвае шляхі дзяржаўнай самаідэнтыфікацыі, адметна пошукам устойлівых духоўных і эстэтычных каштоўнасцей. У мастацтве Беларусі за апошнія дзесяцігоддзі рэалізаваны шэраг твораў, якія ўвекавечваюць вобраз Францыска Скарыны ў манументальнай скульптуры: помнік Францыску Скарыне ў Мінску (2006, скульптар А. Дранец, архітэктары М. Вінаградаў, В. Крамарэнка); у Лідзе (1993, скульптар В. Янушкевіч); помнікі асветніка Ф. Скарыны, устаноўленыя за мяжой, у Празе (1996, Чэшская Рэспубліка, скульптар Э. Астаф'еў, архітэктар Ю. Казакоў), і Калінінградзе (2004, Расійская Федэрацыя, скульптар А. Арцімовіч), а таксама помнік Ф. Скарыне ва ўнутраным дворыку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1999, Мінск, скульптар С. Адашкевіч) і мастацкая інтэрпрэтацыя вобраза Ф. Скарыны ў помніку студэнту, які ўстаноўлены каля Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта (2013, Мінск, скульптар П. Лук).

Імпульсам для ўвасаблення вобраза беларускага гуманіста XVI ст. у пластыцы стаў арганізаваны ў 1991 г. рэспубліканскі конкурс праектаў на помнік Францыску Скарыне для г. Мінска. За перыяд правядзення трох этапаў конкурсу вызначаліся розныя пляцоўкі пад устанаўленне помніка, сярод якіх тэрыторыя верхняга горада (схіл ля Мінскага Свята-Духавага кафедральнага сабора), а таксама пешаходная зона перад будынкам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Па выніках конкурса перамогу атрымаў зусім малады на той час скульптар Алесь Дранец [2, с. 44]. Праект мастака заснаваны на аўтарскім прачытанні вобраза першадрукара. Гэта паказчык таго, што за дзесяцігоддзе, такі кароткі ў гістарычным плане адрэзак часу, у нашай краіне адбылося шмат значных змен, у тым ліку і ў творчым асяроддзі. Прыйшло новае пакаленне скульптараў, якое атрымала магчымасць сказаць сваё гучнае слова ў манументальнай пластыцы. Кардынальна змянілася пластычная мова іх твораў, якія захавалі грунтоўнасць у распрацоўцы тэмы, але сталі ўспрымацца найперш асацыятыўнымі, сімвалічнымі, знакавымі акцэнтамі ў сучасным горадзе [2, с. 44] (мал. 1).



Мал. 1. Помнік Францыску Скарыне ў Мінску
(2006, скульптар А. Дранец, архітэктары М. Вінаградаў, В. Крамарэнка)

У помніку Ф. Скарыне аўтар імкнецца ўзмацніць экспрэсіўнасць вобразу, звяртаецца да абагульнення форм, іх лаканічнасці. Выразны сілуэт будуецца на архітэктурнай канструкцыі манументальнай фігуры, вертыкальная калонападобная постаць асветніка з шырока разведзенымі, узнесенымі да гары рукамі, нібы ахінае, благаслаўляе беларускую зямлю. Ф. Скарына трымае кнігу – нязменны атрыбут у вырашэнні вобраза гуманіста. Строгія вертыкалі фігуры канцэнтруюць увагу на партрэтнай выяве героя. Скульптуры ўласціва дакладная прапрацоўка дэталяў.

Пастамент помніка ўпрыгожваюць тры рэльефы. Тонкія і ажурныя, яны прадстаўляюць гарадскія віды Полацка, Прагі і Падуі, у якіх жыў і спыняўся ў сваіх падарожжах Францыск Скарына. Пачатковую адукацыю Скарына атрымаў у Полацку, дзе сярод іншых навук асвоіў латынь. Час падарожжаў для будучага асветніка пачаўся рана. Але амаль у кожнай кнізе ён згадвае пра сваю Радзіму. Прага – надзвычай важны горад і для Скарыны, і ўвогуле для беларускай культуры. Менавіта там Скарына выдаў сваю першую Біблію на беларускай мове. А Падуя, дзе ён атрымаў доктарскую ступень у знакамітым універсітэце, увяла яго ў шэраг выдатных дзеячаў свайго часу, першаадкрывальнікаў эпохі Адраджэння, на якіх раўняліся будучыя пакаленні.

Помнік Ф. Скарыне, устаноўлены каля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, разлічаны на два этапы і два ракурсы ўспрымання: з адлегласці выразны, набліжаны да знака сілуэт фігуры, а блізка – рэльефы на п'едэстале, ілюстрацыі падзей з жыцця і дзейнасці героя. Дакладна характарызуе помнік І. Мятліцкая: "Ідэйна-вобразная структура перадае імкненне скульптара да шырокага абагульнення, да стварэння вобраза-сімвала, які ўвасабляе спрадвечнае імкненне чалавека да адкрыцця новых шляхоў пазнання. Дзякуючы буйному маштабу, лаканічнасці форм, якія нібы канцэнтруюць духоўную энергію, помнік арганічна ўваходзіць у архітэктурны кантэкст, візуальна і сэнсава ўзбагачае вялікую прастору" [2, с. 45].

Вынікам конкурса 1991 г. па ўвекавечванні ў манументальным мастацтве вобраза беларускага першадрукара з'явіўся шэраг іншых скульптурных твораў, сярод якіх помнік Ф. Скарыне скульптара Валянціна Янушкевіча (мал. 2).



Мал. 2. Помнік Францыску Скарыне ў Лідзе
(1993, скульптар В. Янушкевіч)

Цэльны, маналітны характар помніка з выразным франтальным вырашэннем агульнай кампазіцыі іканаграфічна адпаведны. Графічна прапрацаваныя партрэтныя рысы маладога твару першадрукара, выразны жэст рук, разам ствараюць натхнеты вобраз. Ажурная дэталізацыя касцюма ў спалучэнні з гладкай паверхняй калонападобнай постаці ажыўляюць масіўную прыземістасць скульптурнага твору.

Скульптурныя выявы асветніка, устаноўленыя за мяжой, – у Празе скульптара Э. Астаф'ева і Калінінградзе скульптара А. Арцімовіча – таксама былі прадстаўлены на рэспубліканскі конкурс 1991 г. Сёння гэтыя "замежныя" помнікі, устаноўленыя ў Чэхіі і Расіі ў гонар славутага першадрукара з Полацка, выконваюць асаблівую ролю, з'яўляюцца свайго роду пасланнікамі беларускай культуры іншым народам.

Скульптурная кампазіцыя Эдуарда Астаф'ева стала часткай архітэктурна-мастацкага асяроддзя градчан (летні палац каралевы Ганны і англійскія сады), дзе Францыск Скарына працаваў батанікам па запрашэнні караля Фердынанда I (мал. 3).



Мал. 3. Помнікі асветніка Ф. Скарыны ў Празе
(1996, Чэшская Рэспубліка, скульптар Э. Астаф'еў, архітэктар Ю. Казакоў)

Побач з помнікам устаноўлены камень з надпісам на беларускай і чэшскай мовах: "1535–1539. У гэтых месцах працаваў каралеўскім батанікам выдатны беларускі гуманіст і ўсходнеславянскі першадрукар Францішак Скарына" [3]. "З Прагай звязаны два перыяды дзейнасці Ф.Скарыны. Тут ён пры дапа-

мозе віленскіх мецэнатаў стварыў першае ў гісторыі беларускае выдавецтва, пераклаў, пракаментаваў і надрукаваў 23 кнігі Бібліі (1517–1519гг). Пражскае выданне Бібліі было значнай падзеяй навуковага і грамадскага значэння, а таксама мастацка-паліграфічным шэдэўрам” [3, с.99].

У вобразе Ф.Скарыны, створаным Эдуардам Астаф’евым, спалучаюцца яго характарыстыкі і як канкрэтнага чалавека, і як сімвала беларускай культуры. Урачыстая і адначасова спакойная постаць. “У яго напружаным позірку спалучыліся інтэлектуальнасць вучонага-асветніка і цвёрдасць, перакананасць грамадскага дзеяча і патрыёта. Дэмакратычнасць і чалавечнасць вобраза прачытваецца ў жывых рысах твару, падкрэслены нізкім для такога помнка (вышыня скульптуры 2,3 м) пастаментам, натуральнасцю позы і характарам лепкі – абагульненасцю і выразнасцю прапрацоўкі дэталяў” [3, с.100]. У адной руцэ Ф. Скарыны – пяро, у другой – пражская Біблія, разгорнутая на тытульным лісце. Дастаткова камерныя памеры помніка адпавядаюць характару архітэктурнага асяроддзя.

У помніку Скарыне, устаноўленым у Калінінградзе скульптарам Анатолем Арцімовічам, выкарыстаны амаль жанравы матыў – гуманіст, вандроўнік, які ў час падарожжа прысеў на камень. Аўтар дабіваецца псіхалагічна паглыбленага, па-філасофску напоўненага, ёмістага прачытання вобразу. У адрозненні ад іншых помнікаў, прысвечаных Ф. Скарыне, гэты скульптурны твор не кананічны, дэманструе смелую аўтарскую не традыцыйную трактоўку вобраза (мал. 4).

Ініцыятыва ўстанаўлення помніка беларускаму першадрукару на тэрыторыі Балтыйскага федэральнага ўніверсітэта імя Імануіла Канта належыць нацыянальнаму таварыству “Калінінградскае зямляцтва беларусаў”.

Арыентацыя на еўрапейскую традыцыю стварэння алеі выдатных дзеячаў нацыянальнай навукі і культуры спарадзіла ўзнікненне цэлага “пантэону” выяў нацыянальных герояў Беларусі ва ўнутраным дворыку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Скульптурны твор Сяргея Адашкевіча нагядна дэманструе праблемы, звязаныя з персаніфікацыяй гістарычнай асобы. Звыклае, распаўсюджанае ў грамадстве стэрэатыпнае ўяўленне аб героі, дыктуе аўтару некаторыя мастацкія вырашэнні ў знешнім аблічча Ф. Скарыны. Скульптар імкнецца найбольш выразна падкрэсліць значнасць дзейнасці асветніка, гуманіста, уводзячы ў кампазіцыйную структуру выяўленчыя элементы, што асацыіруюцца з духоўнай спадчынай героя. Стэрэатыпнае ўяўленне аб выяве Ф. Скарыны робіць гэты твор пазнавальным (мал. 5).



Мал. 4. Помнік Францыску Скарыне ў Калінінградзе (2004, Расійская Федэрацыя, скульптар А. Арцімовіч)



Мал. 5. Помнік Францыску Скарыне ў Мінску (унутраны дворык БДУ) (1999, скульптар С. Адашкевіч)

Постаць Францыска Скарыны знайшла сваё праламленне ў помніку студэнту ля сталічнага ўніверсітэта. Фігуратыўная кампазіцыя ўстаноўлена з нагоды святкавання 80-годдзя Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Скульптар Павел Лук сродкамі асацыятыўнай інтэрпрэтацыі стварае вобраз юнака, які з’яўляецца мастацкай цытатай беларускага асветніка (мал. 6).

Вышэйадзначаныя творы сучаснай манументальнай скульптуры, прысвечаныя славутаму дзеячу беларускага Адраджэння, пазбягаюць дыстанцыі паміж помнікам і гледачом. Невысокі подыум, тыповы для сучасных помнікаў у адрозненне ад манумента, дазваляе больш блізкі кантакт. Помнік “падпускае” да сабе, дае магчымасць пазнаць героя, ацаніць майстэрства скульптара ў перадачы партрэтных і іканаграфічных рысаў, дэталяў касцюма і атрыбутыкі. Менавіта форма помніка спрыяе стварэнню пэўнага настрою, выклікае цікавасць да героя, эпохі.



Мал. 6. Помнік студэнту ў Мінску (цэнтральны корпус БДЭУ)
(2013, скульптар П. Лук)

Вобраз Ф. Скарыны мае дзве асноўныя тэндэнцыі трактоўкі – рэпрэзентатыўнае вырашэнне (скульптара А. Дранца) і камернае (скульптара А. Арцімовіча), з дамінуючай эмацыянальна-псіхалагічнай афарбоўкай. Агульным як для парадных, так і для лірычных па сваёй танальнасці помнікаў з’яўляецца імкненне скульптараў да ўвасаблення ў пластычнай, кампазіцыйнай і стылістычнай структуры гістарычнай прасторы героя, стварэння вобраза эпохі.

Яснае ўсведамленне інтэлектуальных і духоўных каштоўнасцей дзейнасці асветнікаў, гуманістаў справаджае актывізацыю пластычных сродкаў манументальнай скульптуры ў вобразах мінулага, відавочна ўпэўненае выдзяленне ўнутранай цэльнасці, значнасці, імкненне выявіць лепшыя якасці чалавека актыўнага, дзейнага. Скульптары спасцігаюць індывідуальныя асаблівасці аблічча героя, фіксуюць уласцівую яму характэрнасць форм, больш паглыблена вывучаюць іканаграфічныя рысы. Манументальныя вобразы асветніка Францыска Скарыны духоўна насычаныя, псіхалагічна выразныя. Глыбокае ідэйнае гучанне гэтых помнікаў – аснова іх мастацкага ўздзеяння.

**Высновы**. У помніках знакамітым беларускім асветнікам выказваюцца актуальныя ва ўсе часы ідэі гуманізму і маралі. Гэта своеасаблівыя арыенціры, па якіх народ вызначае сваё жыццё і выхоўвае маладыя пакаленні. Адпаведна часу, яго прыярытэтам у сацыяльнай і культурнай сферы грамадская свядомасць спараджае выяўленчы вобраз у мануменце.

Палітычныя і эканамічныя пераўтварэнні апошніх дзесяцігоддзяў у Беларусі, працэсы глабалізацыі непасрэдным чынам паўплывалі на развіццё манументальнай скульптуры канца XX – пачатку XXI ст., відавочна імкненне захаваць нацыянальную ідэнтычнасць.

На прыкладзе помнікаў, прысвечаных Францыску Скарыне, можна сцвярджаць аб фарміраванні пластычных і стылістычных асаблівасцей гістарычнага жанру. Манументальнай скульптуры канца XX – пачатку XXI ст. уласціва імкненне да гістарычнай адпаведнасці вобраза, жанравай характэрнасці. Нягледзячы на кампазіцыйную і пластычную разнастайнасць, большасці помнікаў уласцівы дакументальна-жыццёвая трактоўка і насычанасць жанравымі атрыбутамі, што, у сваю чаргу, робіць гэтыя творы лёгкімі для ўспрымання, пазнавальнымі, аднак прамалінейнасць, хрэстаматыйнасць у трактоўцы герояў значна зніжае глыбіню ідэйна-вобразнага ўздзеяння твора [4]. Аднак нельга адмаўляць наяўнасць пазітыўных, наватарскіх рыс, якія можна прасачыць у мастацкай сістэме твораў, і перш за ўсё – гэта імкненне скульптараў да стварэння помніка, дзе яднаюцца духоўная насычанасць і псіхалагічная, эмацыянальная выразнасць вобраза, носьбіта нацыянальнай культуры.

Вобраз славутага дзеяча беларускай культуры, помнікі Францыску Скарыне падкрэсліваюць сацыяльную значнасць манументальнай скульптуры ў грамадстве, вырашаюць актуальныя праблемы духоўнага выхавання.

ЛІТАРАТУРА

1. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. / Акад. навук Беларус. ССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – Т. 6 : Пачатак 1960-х – сярэдзіна 1980 гг. – 1989. – 376 с.

2. Мятліцкая, І. Гісторыя ствараецца тут і цяпер. Мастакі ў храме кнігі. Скульптура / І. Мятліцкая // Мастацтва. – 2006. – № 6. – С. 42–46.
3. Шамрук, А. Прыйшоў з мінулага, каб увайсці ў будучыню. Помнік Францішку Скарыне ў Празе / А. Шамрук // Роднае слова. – 2000. – № 9. – С. 99–100.
4. Чайко, М.П. Праблема персаніфікацыі мастацкіх вобразаў нацыянальнай спадчыны ў сучаснай манументальнай скульптуры Беларусі / М.П. Чайко // Культурная спадчына беларускага народа: праблемы захавання і развіцця : зб. навук. арт. магістрантаў і аспірантаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва / Белар. дзярж. ун-т культуры і мастацтва ; рэдсавет: М. А. Мажэйка (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – С. 144–147.
5. Чайко, М.П. Мастацкія вобразы нацыянальнай спадчыны ў манументальнай скульптуры / М.П. Чайко // Сучаснае мастацтва Беларусі: панарама, перспектывы : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 30 крас. 2009 г. / Беларус. дзярж. акад. Мастацтваў ; рэдкал.: С. П. Вінакурава [і інш.]. – Мінск, 2009. – С. 50–54.

## ON THE EVE OF THE 500TH ANNIVERSARY OF BELARUSIAN AND SLAVIC LITERATURE: IMAGE OF FRANCIS SKORYNY IN MONUMENTAL SCULPTURE

***M. CHAIKO***

*The article presents a critical analysis of the monuments dedicated to the East Slavic book printing pioneer Francis Skorina. The study focuses on monumental sculptural works of Belarusian authors created at the turn of the XX - XXI century in Belarus and abroad. The analysis of sculptural works dedicated to Francis Skaryna helps to identify trends in the development of monumental sculpture of the historic genre. Particular attention is paid to the description of basic principles of thematic, compositional and artistic formation in contemporary monumental sculpture of Belarus. The study reveals specific developments in monumental sculpture of Belarus in the late twentieth and early twenty-first century.*

PolotskSU